У Гродне 16–18 мая пройдуць Дыяцэзіяльныя дні моладзі

Аўтар: Рэдакцыя
25.04.2014 00:00



Дыяцэзіяльныя дні мола-дзі бяруць пачатак у 1993 годзе, калі біскуп Аляксандр Кашкевіч па прыкладзе Святога Айца Яна Паўла II вырашыў прысвяціць асаблівую ўвагу выхаванню маладых вернікаў. Першы з'езд адбыўся ў маі 1993 г., і з той пары штогод каталіцкая моладзь з усёй дыяцэзіі збіраецца на сумесную сустрэчу і малітву.

Сёлетнія XXI Дыяцэ-зіяльныя дні моладзі адбудуцца 16–18 мая 2014 г. у гродзенскай парафіі Божай Міласэрнасці (Вішнявец). Маладыя людзі запрашаюцца на іх, каб умацаваць сваю веру, а таксама перажыць прыгожую сустрэчу з Богам і сваімі равеснікамі.

Дэвізам Дзён моладзі будуць словы:
"Убогія духам маюць доступ да неба". †

Умовы ўдзелу:

- узрост ад 15 гадоў;
- рэлігійныя намеры;
- наяўнасць адказнага за групу;
- спіс удзельнікаў (імя, прозвішча, узрост, населены пункт);
- сродкі гігіены і рэкамендаваныя лекі;
- кубак, лыжка і міска;
- асабісты ўзнос 20 000 бел. руб. (існуе магчымасць вызвалення ад узносу).

Падчас удзелу ў сустрэчы можна будзе зрабіць прэзентацыю сваёй групы. Прэзентацыя павінна быць падрыхтавана максімальна на 5-7 хвілін і мець характар адказу на пытанне: "Што сёння значыць быць убогім у духу?" Паведаміць аб удзеле групы неабходна да 11 мая:

- у Гродне кс. Антонію Грэмзу (80152-74-00-73, маб. тэл.: 8029-63-24-373);
- у Лідзе кс. Уладзіславу Сурвілу (маб. тэл.: 8029-86-75-516).

Прыезд і ад'езд уласным транспартам, аўтобусамі і цягніком. З чыгуначнага вакзала і

аўтавакзала:

- гарадскім аўтобусам № 16 (да прыпынку вул. Кабяка каля гіпермаркета “АЛМІ”);
- гарадскімі аўтобусамі № 1, 2, 37, 42, 47 і тралейбусам № 6 (да прыпынку пр. Кляцкова, далей пешшу ў напрамку касцёла).

Праграма

Пятніца, 16 мая

15.00	– рэгістрацыя і рассяленне;
18.30	– прывітанне ўдзель-нікаў і адарацыя Найсвяцейша
19.00	– святая Імша;
20.00	– вячэра;
20.40	– канферэнцыя “Шчас-лівыя ўбогія духам, бо іх ёсць
21.10	– канцэрт;
22.45	– вячэрняя малітва і бласлаўленне.

Субота, 17 мая

9.00	– ранішнія малітвы;
9.30	– катэхезы ў катэхезах (Святыя нашай зямлі атрыма
11.00	– вынікі катэхез;
12.00	– святая Імша;
13.30	– абед;
15.00	– Вяночак да Божай міласэрнасці;
15.15	– прэзентацыя мола-дзевых груп і размова з цікавы
18.00	– вячэра;
19.30	– эўхарыстычная адарацыя і сакрамант пакаяння. “
21.00	– канцэрт;
22.45	– вячэрняя малітва і бласлаўленне.

Нядзеля, 18 мая

9.00	– святая Імша;
10.30	– канцэрт праслаў-лення. Заканчэнне і рассыланне